«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Скончыўся другі працэс за расклейку ўлётак: Круткіну і Спірыдонавай – штрафы

13.02.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Наталля Спірыдонава і Алесь Круткін на судзе. Фота Зміцера Казлова (Шэры кот)

Раніцай 13 лютага ў судзе Першамайскага раёну Віцебску працягнуўся разгляд справы, распачатай у дачыненні да полацкага блогера Алеся Круткіна і віцебскай актывісткі Натальлі Спірыдонава за размяшчэнне ўлёткі «Калгаснай дыктатуры Баста!» на будынку віцебскага ДБК. Суддзя Алена Протас аштрафавала кожнага з актывістаў на 50 базавых велічынь, піша "Віцебская Вясна".

Працэс над Круткіным і Спірыдонавай пачаўся ў судзе Першамайскага раёну яшчэ 12 лютага – амаль адразу пасля заканчэння пасяджэння ў судзе Кастрычніцкага раёна Віцебску, дзе актывістаў судзілі за такую ж налепку, але размешчаную на будынку абласной пракуратуры. Нагадаем,

суддзя **Ілля Белавус** прызнаў актывістаў вінаватымі ў правядзенні несанкцыянаванага пікетаваньня (арт. 23.34) і пакараў Спірыдонаву штрафам (30 б.в.), а Круткіна – **15 суткамі арышту**.

У суд Першамайскага раёну Круткіна прывезлі з віцебскага ізалятара часовага ўтрыманьня.

> Пасяджэнне 13 лютага доўжылася не больш за 10 хвілін. З пратакола, агучанага суддзёй, вынікала, што **Наталля Спірыдонава** *«публічна выказала свае грамадска-палітычная погляды, павесіўшы на будынак плакат, які адлюстроўвае грамадска-палітычныя інтарэсы»*.

Суддзя заявіла, што ў матэрыялах справы маецца інфармацыя пра тое, што заяваў на правядзеньне масавых мерапрыемстваў у гэтым месцы і ў дадзены час у мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы не паступала.

Характэрна, што ў міліцэйскіх пратаколах гаворка вялася толькі пра Спірыдонаву. Пра тое, ці клеіў улётку Круткін, ані слова. З паказанняў сведкі-міліцыянта вынікала толькі тое, што мужчына, падобны да Круткіна, *«стаяў з тэлефонам»*. Гэта было бачна і на відэазапісы, якая дэманстравалася ў першы дзень пасяджэння. На гэта звярнула ўвагу і адвакатка Круткіна. Яшчэ яна заявіла, што невялікую налепку нельга разглядаць як несанкцыянаванае масавае мерапрыемства і прасіла спыніць адміністрацыйную справу.

Суддзя **Алена Протас** выслухала пярэчанні і вынесла рашэнне аштрафаваць Алеся Круткіна і Наталлю Спірыдонаву на **50 базавых велічынь** кожнага **(2700 рублёў на дваіх)**.

Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал *https://t.me/viasna96*

Опубликовать





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?

ГАЛОЎНАЕ

Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года дакумент





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Ад "сутак" да пастрэленых каленяў: як пераследуюць беларусаў за антываенную пазіцыю (дапоўнена)

Палітвязня другі раз судзяць за данаты. Не дапамаглі нават водкуп і прашэнне аб памілаванні

Патрабуем рэабілітацыі 22 асуджаных удзельнікаў мірных сходаў

Новыя затрыманні і ціск на родных каліноўцаў: хроніка пераследу 27-28 лютага (дапоўнена)

Літва заявіла, што не прызнае вынікі выбараў* у Беларусі і заклікала ўлады да дыялогу

МЗС Польшчы: "Мы расчараваныя рашэннем Мінска ператварыць выбары ў фарс і пародыю на дэмакратыю"

"Судовы працэс над Ардовым быў насмешкай з правасуддзя": Заява

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Студзень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

